УДК 392.17

# Рэшткі абрадаў пераходу ў традыцыйнай дзіцячай культуры беларусаў

Якубінская А.Д.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Абрады пераходу (ініцыяцыі) падкрэсліваюць важнасць змянення статуса асобы і зацвярджаюць яе новае месца ў грамадстве на пэўных этапах жыццёвага цыклу. Рэшткі старажытных ініцыяцый прасочваюцца на апошнім абрадзе пасляродавага цыклу – "пастрыжынах". Ва ўзросце 6-8 год адбывалася вылучэнне акрэсленых радзіннымі абрадамі палавых роляў хлопчыкаў і дзяўчынак, што праяўлялася ў іх назвах адпаведна полу. Абрад апранання першых уласных штаноў хлопчыкам і першай уласнай спадніцы дзяўчынкай сімвалізаваў замацаванне іх палавых роляў знешнімі сродкамі – пры дапамозе вопраткі. Змена "малочных" зубоў на карэнныя лічыцца ў традыцыйных сялянскіх грамадствах усходніх славян прыкметамі "канчатковага ачалавечвання", а абрад развязвання пупавіны – прыкметай "з'яўлення розуму" і пачаткам далучэння да свету дарослых. Звычка малочныя зубы дзяцей закідваць на печ, звяртаючыся пры гэтым з адмысловым прыгаворам да мышкі, каб тая "дала касцяны зубік", магчыма, таксама з'яўляецца рэшткамі старажытнага пераходнага абраду. Рэшткі старажытных ініцыяцый прасочваюцца і ў дачыненні да змены статусу дзяўчынак. Так, прыкладна ва ўзросце 10-12 год дзяўчаткі пачыналі насіць у якасці галаўнога ўбору вянок і праколвалі вушы, што з'яўлялася адзнакай гатоўнасці дзяўчынкі да дарослага жыцця, да ролі жанчыны-маці. Праколваць вушы, без сведкаў, павінна была ўдовая родная бабка дзяўчынкі пад час першых трох дзён тыдня напярэдадні Вялікадня, але не пазней палудня Вялікага чацвера. Ранку трэба было прамываць малаком роднай маці ці іншай жанчыны-карміліцы. Апрананне вянку, працэс праколвання вушэй і ўвядзення завушніцаў, магчыма, сведчыць аб сімвалічным пераразмеркаванні жаночай долі і прыняцці дзяўчынкі ў жаночую частку сялянскай грамады. Кульмінацыяй абрадаў пераходу, што суправаджалі змену сацыяльнага статусу юнакоў, з'яўлялася традыцыйная вясельная абраднасць беларусаў.